# *Талент Івана Навуменкі*

***(100 год з дня нараджэння пісьменніка, драматурга, празаіка Івана Якаўлевіча Навуменкі)***

Іван Якаўлевіч Навуменка — беларускі пісьменнік і літаратуразнавец, доктар філалагічных навук, акадэмік Акадэміі навук Беларусі, народны пісьменнік Беларусі.



(1925 – 2006)



**Нарадзіўся ў вёсцы Васілевічы Рэчыцкага павета Гомельскай губерні (цяпер — горад у Рэчыцкім раёне Гомельскай вобласці) у сям'і чыгуначніка.**

**Удзельнічаў у Вялікай Айчыннай вайне са студзеня 1942 года ў камсамольскім падполлі. Затым ваяваў у партызанах. У снежні 1943 года быў прызваны ў Чырвоную Армію. Удзельнічаў у баях на Ленінградскім і 1-м Украінскім франтах. Двойчы паранены. Атрымаў кантузію, з-за якой назаўжды страціў нюх.**

**Пасля дэмабілізацыі ў снежні 1945 года працаваў карэспандэнтам Мазырскай абласной газеты «Бальшавік Палесся». У 1950 годзе завочна скончыў Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт. З 1951 года працаваў карэспандэнтам рэспубліканскай газеты «Звязда».**



**З 1953 да 1958 года быў загадчыкам аддзела прозы літаратурнага часопіса «Маладосць». У 1973-1982 гадах — дырэктар Інстытута літаратуры імя Янкі Купалы Акадэміі навук БССР. У 1982-1992 гадах — віцэ-прэзідэнт Акадэміі навук Беларусі.**

Першыя вершы пісьменніка былі апублікаваныя ў 1946 годзе ў раённай газеце. Аднак, як сам ён пазней прызнаваўся, не лічыў гэта пачаткам сваёй творчай кар'еры, паколькі паэзія заўсёды была для яго на другім месцы. Дэбютаваў з апавяданнямі ў 1955 годзе ў часопісе «Маладосць». Гэта былі апавяданні «Сідар і Гараська» і «Эх, махарачка».



Вельмі часта ў аповесцях і апавяданнях Навуменка падымае тэму моладзі ў гады вайны. Ён сам сустрэў вайну семнаццацігадовым. Многія творы ўтрымліваюць аўтабіяграфічныя моманты. Нават першы зборнік пісьменніка, які выйшаў у 1957 годзе, называўся «Семнаццатай вясной». Усяго ж у яго выйшла 11 зборнікаў апавяданняў і аповесцей. Апошні, «Водгулле далёкіх вёснаў», — у 1989 годзе.






У пачатку творчасці пісьменнік у асноўным пісаў апавяданні. Але пазней пачынае ствараць аповесці, раманы і п'есы. Важнае месца ў творчасці Навуменкі займае трылогія: «Сасна пры дарозе», «Вецер у соснах», «Сорак трэці». Яна распавядае пра партызанскую барацьбу супраць нямецкіх захопнікаў і мае маштабны, гераічны характар. Варта таксама адзначыць раман «Смутак белых начэй», прысвечаны фінальнаму этапу вайны. Аўтар без пафасу, простай мовай распавядае пра трагічны лёс чалавека.








Творы пісьменніка перакладзены на латышскую, балгарскую, нямецкую, рускую і іншыя мовы. Акрамя творчасці, займаўся навуковай працай — даследаваў творчасць Максіма Багдановіча, Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча, Янкі Купалы і Якуба Коласа. Апублікаваў каля 200 навуковых прац, у тым ліку 10 манаграфій. У 1981–1984 гадах выйшаў збор твораў пісьменніка ў 6 тамах. А ў 2018 годзе завяршылася выданне 10-томнага Збору твораў пісьменніка, у які ўвайшлі ў тым ліку і вершы Навуменкі.



# ТВОРЫ ІВАНА НАВУМЕКІ Ў БІБЛІЯТЭЦЫ ІМЯ Д.Р. НОВІКАВА




Н 156 в.
Навуменка, І.
Вераніка : апавяданні / І. Навуменка ; аўт. Прадм. Ф. І. Куляшоў. – Мінск : Народная асвета, 1968. – 168 с.

У зборнік уключаны апавяданні, прысвечаныя ў асноўным апісанню жыцця школьнікаў. Шчырыя і добразычлівыя адносіны аўтара да сваіх юных герояў, глыбокае і тонкае раскрыцце іх ідэалаў – усё гэта не толькі хвалюе, але і робіць чытача як бы непасрэдным удзельнікам той падзеі, якая стаіць у цэнтры апавядання.




**Н 156 в. у.**
**Навуменка, І.**
**Вецер у соснах : раман / І. Навуменка. – Мінск : Мастацкая літ., 1975. – 328 с.**

**Раман «Вецер у соснах» прысвечаны тэме партызанскай барацьбы на Палессі. Яго трэба лічыць працягам кнігі «Сасна пры дарозе», але ў той жа самы час – гэты самастойны твор, бо ў яго прыйшлі новыя праблемы і новыя героі.**




**Н 156 в. д.**
**Навуменка, І.**
**Водгулле далёкіх вёснаў : апавяданні, аповесці / І. Навуменка. – Мінск : Мастацкая літаратура, 1989. – 454 с.**

**У кнігу ўключаны лепшыя, найбольш вядомыя апавяданні і аповесці лаўрэата Дзяржаўнай прэміі БССР Івана Навуменкі. Лепшыя старонкі лірычнай прозы аўтара прываблiваюць шчырасцю пачуцця, паэтычнай настраевасцю, эмацыянальнай напружнасцю, псіхалагічнай дакладнасцю і праўдай мастацкіх дэталяў.**




**Н 156 л.**
**Навуменка, І.**
**Летуценнік. Смутак белых начэй : раманы / І. Навуменка. – Мінск : Мастацкая літаратура, 1985. – 384 с.**

**Раман «Летуценнік» прысвечаны станаўленню творчай і навуковай інтэлегенцыі 50-х гадоў. Аўтар пераканаўча і ярка паказвае атмасферу тагу часу, стварае цікавыя, запамінальныя вобразы. Лёс чалавека на вайне – тэма рамана «Смутак белых начэй».**



**Н 156 с. п.**
**Навуменка, І.**
**Сасна пры дарозе : раман / І. Навуменка. – Мінск : Мастацкая літ., 1975. – 344 с.**

**Раман «Сасна пры дарозе» апавядае пра першы год Вялікай Айчыннай вайны 1941-1945 гадоў, пра барацьбу савецкіх людзей супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў.**




**Н 156 с. т.**
**Навуменка, І.**
**Сорак трэці : раман / І. Навуменка. – Мінск : Мастацкая літаратура, 1976. – 240 с.**

**Раманам «Сорак трэці» вядомы беларускі пісьменнік Іван Навуменка завяршае трылогію, пачатую кнігамі «Сосна пры дарозе» і «Вецер у соснах». Пісьменнік расказвае пра ўсанародны партызанскі рух на палескай зямлі, які дасягнуў свайго апагея ў памятным сорак трэцім годзе. У рамане чытач сустрэнецца і са знаёмымі героямі, характары якіх атрымалі далейшае развіцце, і з новымі.**



**Н 156 т. ю.**
**Навуменка, І.**
**Таполі юнацтва : апавяданні / І. Навуменка ; мастак П. Калінін. – Мінск : Беларусь, 1966. – 240 с.**

**«Таполі юнацтва» — чацвёрты зборнік апавяданняў Івана Навуменкі. Тут чытач знойдзе апавяданні, прысвечаныя цяжкім выпрабаванням Айчыннай вайны, якія ляглі на неакрэпшыя плечы яго маладых герояў.**




**Н 156 г. н.**
**Навуменка, І.**
**Гасцініца над Прыпяццю : аповесці і апавяданні / І. Навуменка. – Мінск : Мастацкая літ., 1994. – 253 с.**

**У кнігу вядомага беларускага пісьменніка Івана Навуменкі ўвайшлі аповесці і апавяданні, напісаныя за апошнія гады. Дасведчаны майстар прозы, ён апісвае сваё роднае Палессе, закранутае чорным крылом Чарнобыля, па-новаму ацэньвае сённяшні дзень і нядаўняе мінулае.**




Н 341 г. б.

Науменко, И. Я.

Грусть белых ночей : повести, роман: пер. с бел. / И. Я. Науменко. – М. : Известия, 1988. – 527 с.




Н 341 м.
Науменко, И. Я.
Мечтатель : роман, рассказы: авториз. пер. с бел. / И. Я. Науменко. – М. : Советский писатель, 1987. – 417 с.

Роман белорусского прозаика Ивана Науменко «Мечтатель» посвящен научной и творческой интеллигенции послевоенного времени. В книгу вошел и цикл рассказов, написанных И. Науменко в последние годы.




**Н 341 п. о.**
**Науменко, И. Я.**
**Последняя осень : рассказы, повести: авториз. пер. с бел. / И. Я. Науменко. – Минск : Мастацкая літаратура, 1979. – 416 с.**

**В книгу Ивана Науменко «Последняя осень» вошли его лучшие рассказы и повести разных лет. Герои многих из них искренние, еще немного наивные юноши и девушки, на неокрепшие плечи которых легли трудные испытания Великой Отечественной войны.**

# *Талент Івана Навуменкі*

***(Віртуальную выставу падрыхтавала бібліятэкар 2-й катэгорыі Лапцева Л.Д.)***